ПАДЗЕЯ

# У ІМЯ БУДУЧЫНІ

**МІНСК. 3-4 чэрвеня 2026 года ў сталіцы нашай Радзімы адбылася значная гістарычная падзея – І Форум маладых літаратараў Беларусі. У прадстаўнічым сходзе прыняла ўдзел дэлегацыя літаратурнай Гродзеншчыны.**

У гэтыя дні на пачатку лета ў сталіцу з’ехаліся захопленыя літаратурнай творчасцю аўтары ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў з усіх рэгіёнаў краіны. Арганізатары форуму – Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і грамадскае аб’яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі» пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

Асноўная мэта мерапрыемства – даць магчымасць літаратарам-пачаткоўцам увайсці ў літаратурны працэс, стаць часткай прафесійнай пісьменніцкай супольнасці. Задачы: пошук маладых таленавітых пісьменнікаў; павышэнне літаратурнага майстэрства маладых пісьменнікаў, іх культурнага і адукацыйнага ўзроўню; прадстаўленне шырокай чытацкай аўдыторыі найбольш таленавітых твораў маладых аўтараў-удзельнікаў форуму; выяўленне лідэраў сярод маладых пісьменнікаў; нацэльванне на стварэнне важных для краіны літаратурных твораў.

Падчас форуму адбыліся цікавыя і вельмі карысныя сустрэчы ў Мемарыяльнай зале Дома літаратара, з рэдакцыямі выдавецтваў, літаратурных часопісаў; работа была арганізавана па трох секцыях – проза; паэзія; публіцыстыка, крытыка і драматургія. Прайшлі сустрэчы з рэжысёрамі-пастаноўшчыкамі тэатральна-відовішчных устаноў на базе Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра; наведванне вядучых прамысловых прадпрыемстваў.



У Нацыянальнай бібліятэцы адбылася дыялогавая пляцоўка, на якой маладыя пісьменнікі змаглі пагутарыць на актуальныя тэмы з прадстаўнікамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў, вядомымі літаратарамі краіны. Як адзначыў старшыня СПБ Алесь Мікалаевіч Карлюкевіч, папярэдні аналагічны форум айчынных маладых творцаў праходзіў вельмі даўно, у 1999 годзе.

А што ў нас? Праца з адоранай і таленавітай моладдзю, якая ажыццяўляецца Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі, мае доўгатэрміновы, планамерны і ўніверсальны характар. Зацікаўленую моладзь можна бачыць на пасяджэннях створанага нашай пісьменніцкай арганізацыяй грамадскага дыскусійнага клуба «Словадром», на занятках унікальнага грамадска-адукацыйнага праекта – Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы. Маладым аўтарам заўсёды знаходзіцца месца адразу ў некалькіх рубрыках нашага сайта («Зялёны радок» і «Творчасць нашых гасцей»). Яны запрашаюцца для ўдзелу ў публічных мерапрыемствах гарадскога і абласнога ўзроўню, іх творчасць падвяргаецца падрабязнаму літаратуразнаўчаму аналізу. Іншымі словамі – літаратурнай Гродзеншчынай аказваецца разнастайная падтрымка моладзі на працягу ўсяго існавання Гродзенскагна абласнога аддзялення СПБ.

Нагадаем, што 25 мая 2024 года ў Гродне адбыўся абласны семінар маладых пісьменнікаў Гродзеншчыны, удзельнікамі якога сталі восем маладых аўтараў. Некаторыя з іх ліку прынятыя альбо рыхтуюцца ўступіць у шэрагі СПБ (напрыклад, паэтка Вольга Алізар або паэт, празаік, драматург Андрэй Дарожкін). У І Форуме маладых літаратараў Беларусі прынялі ўдзел тры ўдзельніцы нашага семінару 2024 года – паэтэса Ксенія Урбановіч (Свіслацкі раён); празаік Алена Запаснік (Воранаўскі раён) і празаік Наталля Лабеева з Гродна *(на фота).*



*Ксенія Урбановіч*
*Алена Запаснік,*
*Наталля Лабеева*

Пажадаем удзельнікам форуму поспехаў, а яго арганізатарам падзякуем за гэтую важную справу.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

***Выкарыстаны фота з адкрытых крыніц***






WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY


WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY WWW.BELTA.BY


Алексей Иванович
ЧЕРОТА
Александр Николаевич
Агентство МН
МИНСК-НОВОСТИ


СОВРЕМЕННАЯ
литература
СТРАН СНГ
Проза
Азербайджан
Армения
Беларусь
Грузия
Казахстан
Кыргызстан
Молдова
Таджикистан
Туркменистан
Узбекистан
Украина
АНТОЛОГИЯ
Агентство МН
МИНСК-НОВОСТИ


Агентство
МН
МИНСК-НОВОСТИ


WWW.BELTA.BY


WWW.BELTA.BY


ДОМ
ЛІТАРАТАРА
12 - 23




sb.by




ФОРУМ
МОЛОДЫХ ЛИТЕРАТОРОВ
БЕЛАРУСИ
МИНСК-2026
Сладыч
Музей Янкі Купалы
ОАО ПОЛИГРАФКОМБИНАТ
имени Якуба Коласа





ФОРУМ МОЛОДЫХ ЛИТЕРАТОРОВ БЕЛАРУСИ